Таццяна МЕЛЕХАВА

# Зямельная і ваенная рэформы ў Рыме

*Сусветная гісторыя, V клас*

*Зямельная і ваенная рэформы, праведзеныя ў Рыме ў 133, 123, 107 гадах да нашай эры, паслужылі ўмацаванню дзяржавы. Якія захады рабіліся для гэтага? Як гэта ўспрымалі розныя катэгорыі насельніцтва? Для пошуку адказаў на гэтыя пытанні настаўнік арганізоўвае вучэбную дзейнасць вучняў на падставе вучэбнага дапаможніка і дадатковага матэрыялу.*

**Дыдактычныя мэты ўрока:**

плануецца, што напрыканцы ўрока вучні

***будуць ведаць*** становішча Рымскай рэспублікі пасля Пунічных войн, прычыны разарэння рымскіх земляробаў і яго наступствы, час правядзення зямельнай і ваеннай рэформ (133 г. да н. э., 123 г. да н. э., 107 г. да н. э.); прычыны, асноўны змест і вынікі рэформаў братоў Гракхаў і Гая Марыя;

***змогуць*** ахарактарызаваць зямельную і ваенную рэформы; тлумачыць прычыны і вынікі іх правядзення; вызначаць храналогію вывучаемых гістарычных падзей.

**Задачы асобаснага развіцця:** стварыць умовы для развіцця ўменняў вучняў працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі, асэнсоўваць і сістэматызаваць вучэбны матэрыял.

**Сродкі навучання:** Гісторыя Старажытнага свету: вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 2 / пад рэд. У.С.Кошалева. Мінск, 2014; История Древнего мира, 5 класс : рабочая тетрадь : пособие для учащихся общеобразоват. учреждений с русским языком обучения / В.С.Кошелев, Н.В.Байдакова. Минск, 2010; карткі з заданнямі.

**Тып урока:** камбінаваны.

**План урока**

**I.** Арганізацыйны этап.
**II.** Аперацыйна-пазнавальны этап.
1. Рым пасля Пунічных войн.
2. Зямельныя рэформы братоў Гракхаў.
3. Ваенная рэформа Гая Марыя.
**III.** Этап замацавання вывучанага матэрыялу.
**IV.** Этап рэфлексіі.
**V.** Этап інфармавання пра дамашняе заданне.

## Ход урока

### I. Арганізацыйны этап.

Настаўнік вітае вучняў, паведамляе, што яны прадоўжаць вывучаць гісторыю Старажытнага Рыма, і прапаноўвае назваць выбітных дзеячаў гэтай дзяржавы. Заслухаўшы адказы, ён называе дзяржаўных і ваенных дзеячаў, дэманструе іх выявы: Ромула, Нума, Сервія Тулія, Тарквінія Гордага, Сцыпіёна, Катона, братоў Гракхаў, Гая Марыя, Піра і Ганібала — і арганізоўвае франтальнае апытанне.

*Настаўнік.* Разгледзьце выявы, ці ўсе прадстаўленыя гістарычныя асобы вам вядомыя? Хто з іх вам невядомы? ***(Адказ.*** *Тыберый і Гай Гракхі, Гай Марый.)* Гэтыя рымскія грамадзяне ў свой час у Старажытным Рыме правялі аграрную і ваен-



***МЕЛЕХАВА Таццяна Паўлаўна.***

*Педагог дадатковай адукацыі Касцюковіцкага раённага цэнтра дзіцячай творчасці. Нарадзілася ў в. Гнілец Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1987 г. закончыла гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.А.Куляшова. У 1988—1993 гг. працавала настаўніцай гісторыі ў в. Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці, у 1993—2015 гг. — настаўніцай гісторыі, грамадазнаўства і геаграфіі Вялікакрапівенскага вучэбна-педагагічнага комплексу яслі-сад — базавая школа Касцюковіцкага раёна. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. Аўтар больш за 30 метадычных публікацый. Узнагароджана нагрудным знакам Міністэрства адукацыі "Выдатнік адукацыі".*



gisdapamoga.bspu.by

ную рэформы. Сёння іх дзейнасць і сутнасць рэформ мы і будзем вывучаць на ўроку.

З прадстаўленых асоб назавіце старажытных рымскіх цароў і коратка апішыце іх дзейнасць. *(Адказ. Ромул заснаваў Рым; Нума замацаваў законам права ўласнасці на зямлю; Сервій Тулій правёў рэформу, па якой усё насельніцтва было раздзеленае паводле маёмаснага дастатку; Тарквіній Горды, апошні рымскі цар, вырашаў дзяржаўныя пытанні, не раячыся з сенатам і народам, і таму быў выгнаны.)*

**II. Аперацыйна-пазнавальны этап.**

***1. Рым пасля Пунічных войн.***

*Настаўнік.* Разгледзьце ў атласе карту "Рымская імперыя. Падзенне Заходняй Рымскай імперыі (31 г. да н. э. — 476 г. н. э.) і знайдзіце тэрыторыі, якія захапіў Рым. Вы бачыце, што былі заваяваны Македонія і Грэцыя, гарады Малой Азіі і Егіпта. Пасля доўгіх і кровапралітных войнаў рымляне ўсталявалі сваю ўладу ва ўсім Міжземнамор'і. Але ў такой вялікай дзяржаве пастаянна ішла барацьба за зямлю і ўладу.

Войны, якія вялі рымляне на тэрыторыі Італіі, узбагачалі землеўладальнікаў, і яны мелі дастатковую колькасць зямлі. Багачы скуплялі землі земляробаў і стваралі вялікія зямельныя гаспадаркі, у якіх працавалі рабы. Такім гаспадаркам пастаянна неабходна была бясплатная рабочая сіла — рабы. Войны з іншымі народамі надоўга адрывалі сялян ад гаспадаркі. Воіны-землеўладальнікі пасля ваенных паходаў знаходзілі запусцелыя палі, заняпалую гаспадарку. Частымі былі выпадкі гвалтоўнага захопу зямлі ў час адсутнасці гаспадара. Пасля трэцяй Пунічнай вайны вандруючы па Італіі, народны трыбун Тыберый Гракх быў узрушаны тым, што значна паменшылася колькасць сялян-земляробаў. У яго склалася перакананне, што перавага буйнога землеўладання і страшэннае збядненне дробных землеўласнікаў — істотны недахоп і крыніца ўсіх бедстваў у рэспубліцы.

Прачытайце ўрывак з выступлення Тыберыя Гракха перад народам (вучэбны дапаможнік, с. 83) і адкажыце на пытанні: Становішча якой катэгорыі насельніцтва так апісваў Тыберый Гракх? За што, па меркаванні Тыберыя Гракха, ваявалі воіны-земляробы? Хто, на яго думку, быў вінаваты ў такім становішчы? Азагалоўце гэтае выступленне.

Прачытайце ў вучэбным дапаможніку § 21 "Зямельная і ваенная рэформы ў Рыме" п. 1 "Рым пасля Пунічных войн" (с. 80) і адкажыце на пытанні: Што прынесла рымлянам перамога ў Пунічных войнах? Навошта ім былі патрэбны новыя заваяванні? Што хвалявала Тыберыя як грамадзяніна сваёй краіны?

Каб наглядна ўявіць сабе, да чаго прывялі Пунічныя войны, я прапаноўваю вам запоўніць схему "Вынікі Пунічных войн" (курсівам пазначана інфармацыя, якую запісваюць вучні.)

*Схема*

**Вынікі Пунічных войн**

- *Узбагачэнне краіны*
- *Разарэнне сялян*
- *Павелічэнне колькасці рабоў*

***2. Зямельныя рэформы братоў Гракхаў.***

*Настаўнік.* Большасці рымскіх багацеяў было ўсё адно, што сяляне разараюцца. Але сярод знаці былі і такія людзі, якія думалі не толькі пра сваю выгоду, але і пра ўмацаванне Рымскай дзяржавы. Яны разумелі, што разарэнне сялян непазбежна прывядзе да паўстанняў беднаты і аслаблення арміі. Адным з такіх людзей, як вы ўжо зразумелі, быў Тыберый Гракх. Галоўную мэту свайго жыцця ён бачыў у служэнні дзяржаве і цвёрда вырашыў выправіць становішча ў краіне. Аднадумцам быў і яго брат — Гай Гракх. Прачытайце п. 2 "Зямельныя рэформы братоў Гракхаў" (вучэбны дапаможнік, с. 80-81) і даведайцеся, якія мэты ставілі браты Гракхі і як яны іх ажыццявілі.

З мэтай першаснага замацавання матэрыялу настаўнік арганізоўвае гутарку па пытаннях: У якім годзе Тыберый Гракх стаў народным трыбунам? Калі выбралі народным трыбунам Гая Гракха? Чаму Гай Гракх прадоўжыў справу старэйшага брата? Чаму сенатары былі супраць правядзення зямельнага закона і раздачы зямлі бедным рымлянам? Ці згодныя вы са сцвярджэннем, што Тыберый і Гай Гракхі — абаронцы беднаты?

*Настаўнік.* Начарціце ў сшытку стужку часу і адзначце на ёй даты выбрання братоў Гракхаў народнымі трыбунамі — 133 г. да н. э., 123 г. да н. э. Успомніце дату выгнання рымлянамі апошняга рымскага цара Тарквінія Гордага — 510 г. да н. э. і адзначце яе на стужцы час. Падлічыце, колькі паміж гэтымі падзеямі мінула гадоў *(Адказ. 377.)* Падумайце, чаму сенатары забілі братоў Гракхаў.

Заслухаўшы меркаванні вучняў, настаўнік падводзіць іх да разумення таго, што за гэты час у Рымскай рэспубліцы не адбылося грамадзянскай вайны. Аднак у 133 г. да н. э. і ў 123 г. да н. э. у Рыме адбыліся падзеі, якія не здараліся там ужо некалькі стагоддзяў: грамадзяне краіны напалі са зброяй у руках адзін на аднаго. Загінулі народ-

gisdapamoga.bspu.by

ныя трыбуны — асобы недатыкальныя, а разам з імі жорстка былі забітыя і рымскія грамадзяне (больш за трыста ў час забойства Тыберыя Гракха і больш за тры тысячы ў час забойства Гая Гракха). Такім чынам, у Рымскай рэспубліцы пачаліся хваляванні.

Для больш эмацыйнага ўспрымання вучэбнага матэрыялу пажадана вучням расказаць, як Тыберый Гракх патрабаваў зямлі для сялян.

*"...У гэтыя дні ў Рыме толькі і гаварылі аб зямельным заканадаўстве: у дамах багацеяў — з трывогай і злосцю, у хацінах беднякоў — з радасцю і надзеяй. Рым у гэтыя дні напамінаў устрывожаны шумам вулей. У натоўпах запоўненых вуліц і плошчаў Рыма вылзяляліся загарэлыя твары сялян. Яны былі ў грубых даматканых плашчах, многія з палкамі ў руках. Ад сялян пахла зямлёю і гноем...*

*Чуткі аб перадзеле зямлі ўзбудзілі і гарадскіх беднякоў, якія гаравалі ў трушчобах. Яны кінулі свае майстэрні і запоўнілі форум, памятаючы, што іх бацькі і дзяды былі сялянамі.*

*Якія толькі хітрасці не чынілі багацеі, каб толькі знеславіць вялікую ідэю перадзелу зямлі, каб толькі адвярнуць ад яе гарадскі плебс!*

*Праз шум натоўпу і выкрыкі "Далоў" даносіліся словы аратара:*

*— Навошта вам зямля ў гарах Самнія і балотах Этрурыі! Там вы загінеце ад голаду і ліхаманкі! Там могуць жыць толькі рабы, а рымляніну падабае жыць тут, у гэтым вечным горадзе, адчуваючы асалоду дабрабыту цывілізацыі! Ад зямельнага закона не можа быць нічога добрага, акрамя смуты. Людзі, якія ўнеслі яго на абмеркаванне, — не добрыя грамадзяне, а бунтаўшчыкі: яны жадаюць пагібелі рымскаму народу!*

*Натоўп роў і патрабаваў, каб аратар пакінуў трыбуну. Аратар схаваўся ў групе сенатараў.*

*— Тыберый! Тыберый! — раздаліся крыкі.*

*Людзі расступіліся, прапускаючы Гракха. Сенатары і вершнікі, якія стаялі ўперадзе, адышлі ўбок нехаця, быццам бы не жадаючы пускаць Тыберыя да трыбуны.*

*З вышыні трыбуны Тыберый убачыў плошчу, запоўненую людзьмі, якія чакалі праўды, зглададаўшыся па зямлі...*

*Наступіла такая цішыня, што Тыберыю здавалася, быццам бы ён чуе біццё ўласнага сэрца.*

*— І дзікія звяры маюць у Італіі свае норы і логавы, — пачаў ён. — А ў тых, хто змагаўся і паміраў за Рым, няма нічога, акрамя паветра і сонечнага святла!..*

*Гул згоды пракаціўся па плошчы. Словы Тыберыя пранікалі ў душы слухачоў і знайшлі ў іх водгук.*

*— Не, не гібелі дзяржавы дабіваюцца тыя, хто прапаноўвае аграрны закон, а павелічэння яе славы і магутнасці!.. Ці можа стаць дзяржава слабей, калі яе абаронцы атрымаюць зямлю, — зямлю, якая належыць дзяржаве? Ці ж дзяржава загіне, калі няверных рабоў, якія заўсёды думаюць аб мяцяжы, заменяць на палях верныя і працалюбівыя сыны Італіі?..*

*Плошча ўскалыхнулася ад апладысментаў. Сенатары, якія стаялі ў першых радах, скурчыліся, напалоханыя гэтым праяўленнем народнай волі". (Немировский А.И. Тиберий Гракх. История Древнего мира, поурочные разработки : пособие для учителей общего сред. образования с русским языком обучения / В.С.Кошелев, Н.В.Байдакова. Минск, 2010. С. 247-248.)*

Пасля расказу настаўнік задае пытанні вучням: Як беднякі Рыма ўспрынялі закон аб перадзеле зямлі? Як натоўп адрэагаваў на прамову Тыберыя? Якія былі вынікі зямельнай рэформы?

З мэтай першаснага замацавання матэрыялу настаўнік звяртае ўвагу вучняў на табліцу "Зямельныя рэформы братоў Гракхаў" і прапаноўвае яе запоўніць (курсівам пазначаны тэкст, які неабходна запісаць).

*Табліца*

**Зямельныя рэформы братоў Гракхаў**

| Крытэрыі | Рэформа Тыберыя Гракха | Рэформа Гая Гракха |
|---|---|---|
| Час правядзення | *133 год да н. э.* | *123 год да н. э.* |
| Прычыны правядзення | *Страта зямлі сялянамі.* | |
| Мерапрыемствы | 1. Адабранне часткі земель у *багатых* грамадзян і раздача іх *бедным* сялянам. | 1. Продаж *хлеба* бедным гараджанам па *нізкім кошце*.<br>2. Надзяленне *зямлёю* ў *калоніях* бедных і беззямельных грамадзян. |
| Вынік: Не ўдалося спыніць збядненне сялян. | | |

***3. Ваенная рэформа Гая Марыя.***

*Настаўнік.* Браты Гракхі не змаглі палепшыць становішча земляробаў Італіі. Па-ранейшаму беднякоў было вельмі многа. Не ўсе грамадзяне Рымскай рэспублікі мелі надзел зямлі, і, адпаведна, многія задавалі пытанне: "Хто будзе служыць у арміі і абараняць Рым?" Гэтую задачу вырашыў консул Гай Марый. У 107 г. да н. э. ён ажыццявіў ваенную рэформу. *(Настаўнік запісвае дату на дошцы.)* Прачытайце п. 3 "Ваенная рэформа Гая Марыя" (вучэбны дапаможнік, с. 81-82), вызначыце сутнасць рэформы Гая Марыя.

gisdapamoga.bspu.by

Ахарактарызаваць вынікі ваеннай рэформы настаўнік прапаноўвае з дапамогай наступнага тэксту: ён зачытвае сказ, а вучням неабходна яго дапоўніць.

Згодна з ваеннай рэформай Гая Марыя ўсім грамадзянам Рыма было дазволена служыць у ... *(арміі)*, нават ... *(беднякам)*. Служба доўжылася ... *(16)* гадоў. На час службы салдаты атрымлівалі ... *(зброю)*. Ад свайго палкаводца яны атрымлівалі ... *(плату)*. У канцы службы легіянеры надзяляліся ... *(зямлёй)* на заваяваных тэрыторыях. Такім чынам, армія Рыма стала мацней.

Звярніце ўвагу на сказ у тэксце вучэбнага дапаможніка: "*Патрыятызм рымскай арміі стаў саступаць месца асабістай адданасці салдат свайму палкаводцу*" *(с. 82)* — і адкажыце на пытанні: Як вы разумееце сэнс гэтага сказа? Да якіх наступстваў такое становішча магло прывесці? Як вы лічыце, што аб'ядноўвае падзеі, якія адбываліся ў 133, 123, 107 гадах да н. э.? *(Заслухоўваюцца меркаванні вучняў.)* Успомніце і падлічыце, колькі гадоў мінула ад атрымання плебеямі права выбіраць свайго трыбуна да выбрання трыбунамі братоў Гракхаў? ***(Адказ.*** *У 494 г. да н. э.; 361 год і 371 год.)*

**III. Этап замацавання вывучанага матэрыялу.**

Для замацавання вывучанага матэрыялу настаўнік раздае вучням заданні на картцы.

*Картка 1*

**1.** Выкарыстоўваючы прапанаваныя словы, запоўніце тэкст.

Перамога рымлян у Пунічных войнах прынесла ... краіне. Асноўныя работы ў Рыме сталі выконваць ... . Гэта прывяло многіх сялян да ... . А багатыя рымляне змаглі павялічыць сваю ... . Яны стварылі вялікія зямельныя ... .

**Словы:** 1. Уласнасць. 2. Рабы. 3. Гаспадаркі. 4. Разарэнне. 5. Узбагачэнне. ***(Адказы.*** *5, 2, 4, 1, 3.)*

**2.** З прапанаваных літар састаўце слова і даведайцеся, як адным словам можна ахарактарызаваць мерапрыемствы, што праводзілі браты Гракхі і Гай Марый.

**Літары:** а, м, р, ф, р, о, э.

*(Адказ. Рэформа.)*

**3.** Знайдзіце і выдзеліце ў табліцы даты, якія вывучаліся сёння на ўроку.

| | | |
|---|---|---|
| 2 | 1 | 7 |
| 3 | 0 | 3 |
| 1 | 1 | 3 |

**4. Дапішыце сказы.**

**1.** Тыберый Гракх праводзіў рэформу ў ... годзе да н. э. ***(Адказ.*** *133.)* 2. Гай Гракх ажыццяўляў рэформу ў ... годзе да н. э. ***(Адказ.*** *123.)* 3. Гай Марый праводзіў рэформу ў ... годзе да н. э. ***(Адказ.*** *107.)*

**5. Знайдзіце і падкрэсліце памылкі ў тэксце. Замест памылкі напішыце правільны адказ:**

Тыберый Гракх прапанаваў адабраць у бедных грамадзян частку зямлі і перадаць яе багатым. Гай Гракх загадаў раздаваць бедным гараджанам хлеб бясплатна. Ён не дазваляў перасяляцца на заваяваныя землі бедным і беззямельным рымскім грамадзянам. Рэформы братоў Гракхаў актыўна падтрымалі не толькі беднякі, але і сенатары. Братам Гракхам удалося прыпыніць збядненне землеробаў Італіі. Згодна з рэформай Гая Марыя служыць у рымскай арміі маглі толькі багатыя землеўладальнікі. Служба была пажыццёвая. У канцы службы легіянеры атрымлівалі плату.

*Правільны варыянт тэксту выглядае так:*

Тыберый Гракх прапанаваў адабраць у бедных *(багатых)* грамадзян частку зямлі і перадаць яе багатым *(бедным)*. Гай Гракх загадаў раздаваць *(прадаваць)* бедным гараджанам хлеб бясплатна *(па самым нізкім кошце)*. Ён не дазваляў *(дазваляў)* перасяляцца на заваяваныя землі бедным і беззямельным рымскім грамадзянам. Рэформы братоў Гракхаў актыўна падтрымалі толькі беднякі *(сенатары не падтрымалі рэформы)*. Братам Гракхам удалося *(не ўдалося)* прыпыніць збядненне землеробаў Італіі. Згодна з рэформамі Гая Марыя служыць у рымскай арміі маглі толькі багатыя *(не толькі багатыя)* землеўладальнікі. Служба была пажыццёвая *(доўжылася 16 гадоў)*. У канцы службы легіянеры атрымлівалі плату *(надзяляліся зямлёй)*.

**5. Дакажыце сцвярджэнне.**

Ваенная рэформа Гая Марыя прыпыніла разарэнне землеўладальнікаў Італіі і ўмацавала Рымскую дзяржаву.

**IV. Этап рэфлексіі.**

Настаўнік прапаноўвае вучням звярнуць увагу на выявы дзяржаўных дзеячаў, ацаніць, хто з дзяржаўных дзеячаў і які ўклад унёс у дабрабыт Рымскай дзяржавы.

**V. Этап інфармавання пра дамашняе заданне.** Прачытаць § 21 вучэбнага дапаможніка. Выканаць заданні 3, 6, 7 на с. 104-105 рабочага сшытка.



gisdapamoga.bspu.by